## № 18. Ганьне Бабарэцы

*[1930]*

Любая Анечка!

Шчыра дзякую за перадачу. Атрымаў усё. Шкада толькі, што ты бялізну добрую перадала, трэба было што горшае [перадаць] — тут вельмі брудзіцца. *[абарвана]* яшчэ ня *[абарвана]*

## № 19. Ганьне Бабарэцы

*[1930]*

Дарагая і любая Анечка!

Яду, што прыслала ў суботу, атрымаў, шчырае дзякуй.

## № 20. Ганьне Бабарэцы

*[1930]*

Дарагая і любая Анечка!

Перадачу яды і бялізны, што была 14–га, я атрымаў. Шчырае і вялікае дзякуй за любоў, увагу і клопаты, мае вы дарагія і любыя. Толькі глядзеце, ня крыўдуйце сябе і шануйцеся, каб жывы былі і здаровы.

Адсылаю брудную бялізну: сарочку, кальсоны, 2 ручнікі, 3 хусьніцы, 2 пары шкарпэтак, прасьціню, наўлачку і торбу. Пасылаю таксама даручэньне на атрыманьне з ашчадкасы грошай.

Ці атрымала ты даручэньне маё на перавод пая у МЦРК?

Я здароў, моцны і бадзёры. Зі… *[кавалак адарваны]*

## № 21. Ганьне Бабарэцы

*[1930]*

Любая Анечка!

Адсылаю брудную сарочку і пару шкарпэтак.

Прышлі, калі ласка, камізэльку і чаравікі.

Вялікае дзякуй за паліто, бялізну. *[абарвана]*

## № 22. Ганьне Бабарэцы

*[1930]*

Любая Аня!

Атрымаў усё. Калі льга, прынясі колькі аркушаў чыстай паперы. З яды — хлеба не насі. Хапае. А так, любая, што здумаеш. А лепш менш клапаціся. Вось калі льга